агульнай мастацкай сістэме; 2) вызначэнне функцыянальнай ролі вобразаў і матываў, звязаных з найменнем дуба ў развіцці сюжэта літаратурнага твора; 3) выяўленне аўтарскага аўтабіяграфічнага падтэксту ў раскрыцці тэмы эмблематычнасці дуба, абумоўленасці звароту да дадзенай тэмы жыццёвымі акалічнасцямі і светапоглednымі прыярытэтамі пісьменніка.

УДК 070(476)”1916/1918”

Студ. П. А. Моргун
Навук. кір. дац. В. А. Кузьміч
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

## ІНШАМОЎНАЯ ПЕРЫЁДЫКА БЕЛАРУСІ 1916-1918 ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГАЗЕТЫ “DEUTSCHE KRIEGSZEITUNG VON BARANOVITSCHI”)

Гісторыя — тое, што робіць сукупнасць людзей нацыяй. Тое, што дазваляе адказаць на пытанне, хто мы, адкуль мы. На нашу думку, гісторыя — гэта мазаіка, якая складаецца з тысячы дробных момантаў, якія ўрэшце дазваляюць убачыць усю карціну. І толькі ад нас залежыць, наколькі поўнай і падрабязнай яна будзе. Трэба разглядаць гісторыю не толькі ў кантэксце краіны і свету, але і звяртаць ўвагу на гісторыю рэгіёнаў. Бо часта гісторыя горада, яго паўсядзённага жыцця можа многае расказаць пра той ці іншы гістарычны перыяд. Так, напрыклад, у газеце, якую мы даследуем, яшчэ да 1918 года (да абвяшчэння БНР) немцы пачалі называць Беларусь не «Заходнім краем», а Беларуссю (Weissrusland). Упершыню яна згадваецца ў артыкуле пад назвай “Кветкі Беларусі ў ліпені і жніўні” (№ 64 ад 09.08.1916 г.).

Як вядома, Першая сусветная вайна мела страшэнна знішчальны характар і прывяла для глабальных змен у сусветнай гісторыі. Тым не менш, яна недастаткова вывучана ў параўнанні з пазнейшымі трагічнымі падзеямі. Гісторык Ключэўскі казаў: «Гісторыя не настаўніца, а наглядчыца. Яна не вучыць, а карае за нявывучаныя ўрокі». У 1941 годзе наш народ быў жорстка пакараны. Ні адна вайна яшчэ не рабіла шчаслівымі мірных жыхароў. Ніколі не патлумачыш маці, што адправіла сына на вайну, за якую праўду загінула яе дзіця. Таму сёння вельмі важна памятаць не толькі пра Першую і Другую сусветныя войны, але і дбаць пра захаванне агульнай гісторыі.

Адно са сведчанняў падзей Першай сусветнай вайны на нашай тэрыторыі дае нам газета, якая выпускалася нямецкай арміяй на пра-

цягу Першай сусветнай вайны ў акупаваных Баранавічах. Дзякуючы мясцовай прэсе, якую выпускалі немцы, можна зразумець, якую мэту мелі варожыя ўлады, якія размяшчаліся на тэрыторыі Баранавіч.

Адкрываючы для сябе гісторыю горада, варта зазначыць, што Баранавічы некаторы час былі ключавым месцам у кантэксце Першай сусветнай вайны. На працягу першага года вайны ў Баранавічах знаходзілася стаўка галоўнакамандуючага – галоўны штаб усіх узброеных сіл Расіі. Сюды неаднойчы прыязджаў расійскі імператар Мікалай II, які ў агульнай колькасці быў тут 2 месяцы і наведваў Баранавічы каля 10 раз. Захавалася шмат фотаздымкаў, якія зафіксавалі гэты гістарычны момант. На жаль, дамы, дзе жыў падчас сваіх візітаў Мікалай II, у 2015 годзе былі знесены, а на іх месцы цяпер знаходзіцца звычайны паркінг. Падчас апошняга візіту (11–28 чэрвеня 1915 г.) Мікалай II загадаў перанесці стаўку ў Магілёў, дзе яна знаходзілася да канца вайны. У ноч з 23 на 24 верасня 1915 г. у горад ўвайшлі першыя аўстрыйскія патрулі, што сведчыла пра акупацыю баранавіцкіх зямель.

Такім чынам Баранавічы былі ўцягнуты ў падзеі Першай сусветнай вайны. Мірнае насельніцтва не вельмі пакутавала ад акупацыйнага рэжыму. Людзі, як і раней, працавалі на заводах, толькі вытворчасць ужо была арыентавана не на рускую армію, а на нямецкую.

У перыяд з 1915-1919 г. у Баранавічах і ваколіцах было адчынена каля 100 школ. Гэта сведчыць пра тое, што немцы былі неабыякавымі да мірнага насельніцтва. На галоўнай вуліцы горада працавала шмат магазінаў, штомесяц у горад прыязджалі тэатры, штотыдзень гараджане маглі глядзець кіно, працавала тыпаграфія (заснаваная ў 1909 годзе), якая была названа ў гонар яе заснавальніка “Тыпаграфіяй Брэгмана”. На жаль, звестак пра асобу Брэгмана не захавалася, але затое засталася кніга яго тыпаграфскіх шрыфтоў.

Назва газеты «Deutsche Kriegszeitung von Baranovitchi» перакладаецца як “Нямецкая ваенная газета Баранавіч”. Дзякуючы педантычнасці немцаў, а дакладней нацыянальнай бібліятэцы нямецкага горада Дэтмольд, нам удалося знайсці ў адсканаваным варыянце большую частку асобнікаў газеты, што дазволіла прааналізаваць яе і даследаваць.

Газета зачароўвае сваім выглядам. Яна аформлена гатычным шрыфтам, які выглядае вельмі прыгожа, але і чытаецца вельмі цяжка. Таксама атрымалася знайсці месца, дзе знаходзілася тыпаграфія газе-

ты, план яе памяшканняў, і  нават месца і фотаздымкі крамы, якая называлася таксама, як і газета.

Аналізуючы газету, можна вылучыць яе агульную структуру, зразумець, на што ставіўся асноўны акцэнт, якія тэндэнцыі панавалі ў публікацыях пра Баранавічы і ваколіцы. У кожным нумары вялікая ўвага надавалася навінам з фронту, яны звычайна знаходзіліся на першай паласе.

Калі ў Баранавічы прыязджаў кайзер Вільгельм, тады на першай паласе публікаваўся яго фотаздымак, асноўныя біяграфічныя звесткі і інфармацыя пра мэту яго візіту. У кожным нумары ёсць калонкі, прысвечаныя навінам Баранавіч і ваколіц. Амаль у кожным нумары публікаваўся нейкі верш або гімн. Звычайна яны былі прысвечаны вайне, а таксама былі вершы, прысвечаныя Баранавічам. Таксама ў адным са спецыяльных нумароў быў гімн самой газеты.

Пра папулярнасць газеты можа сведчыць той факт, што ўсю апошнюю старонку займае розная рэклама. Напрыклад, сваю тыпаграфію рэкламаваў спадар Бергман, там заўсёды публікавалася рэклама кіно, розных фотаатэлье. Размяшчаліся абвесткі пра тое, дзе і калі будуць адбывацца выступы вандроўнага тэатра.

Сама газета складалася з 4 старонак, каштавала 5 фенінгаў і выходзіла два разы на тыдзень. Як бачна, газета карысталася вялікім попытам.

Дзякуючы газеце, можна ўявіць сабе Баранавічы пачатку XX стагоддзя, бо такой колькасці фотаздымкаў не знойдзеш нават у краязнаўчым музеі. У адным з выпускаў ёсць артыкул, прысвечаны апісанню беларускай вёскі, яе фотаздымкі. У іншым нумары мы знайшлі фотаздымкі вёскі, у якой пражывалі нашы прадзеды.

Даследаванне публікацый згаданай газеты дазваляе знайсці рэдкія сведчанні жыцця рэгіёна ў складаны час Першай сусветнай вайны і мае несумненную краязнаўчую карысць.

Асобна трэба адзначыць, што палітыка акупацыйных улад падчас Першай сусветнай вайны, яе лаяльнасць да мясцовага насельніцтва стварылі няправільнае ўяўленне пра акупацыю. Таму на пачатку Вялікай Айчыннай вайны насельніцтва заходніх рэгіёнаў Беларусі (і не толькі) не адразу зразумела захопніцкую і бесчалавечную сутнасць фашысцкіх войск і іх планы ў дачыненні да Беларусі, што абярнулася незлічонымі бедамі для краіны.